**Прохарава Ангеліна**

# Я – ПАМЯТАЮ

**(прабабулі Насці – Кілбас Анастасіі Міхайлаўне –**

**са спаленай вёскі Грабаў)**

Успаміны пра вёску ў пажары згаралі,
Ад бяды, ад навалы людзі ў лес уцякалі.
У марозы зімой начавалі пад елкамі,
Мамы дзетак люлялі калыханкамі-енкамі.
Іх фашысты штодня азвярэла шукалі,
Ды мяцелі-завеі ўсе сляды замяталі.
Не кастры саграваілі – надзеі гаючыя:
Ноччу ж спаць не давалі сны трывожна-балючыя.
Маці слёзы тады ад дачушкі хавала,
Як на лёс і на долю малой наракала.
Сем гадоў усяго той дзяўчынцы мінулася,
А яна сцюжным ранкам дарослай прачнулася.
Ды забыла, як дома з братамі гуляла,
Як матулі сваёй кожны дзень памагала.
Бо ўсё словам *“вайна”* назаўжды разбурылася,
Бо дзіцячае шчасце сярод лесу згубілася.
І ад стрэлаў далёкіх дзяўчынцы не спіцца,
І вясёлка над лугам цёмнай ноччу не сніцца.
– Дзе ж мой тата? – дачушка ў матулі пытаецца.
– А твой тата, дзіцятка, з лютым зверам змагаецца.
Хутка вернецца ён па дачушку-прынцэсу,
Забярэ ў светлы дом нас з зямлянкі між лесу.

***

– Не забуду *пра гэта*! – вусны ўнучкі шапнулі...
Ручкі выцерлі слёзы на шчоках бабулі...